# Рэгламент правядзення Конкурсу да Інкубацыйнай праграмы “Пясочніца”

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Гэты Рэгламент вызначае парадак арганізацыі і правядзення Конкурсу да Інкубацыйнай праграмы “Пясочніца” (далей — Конкурс).

Інкубацыйная праграма “Пясочніца” з’яўляецца кароткатэрміновай праграмай падтрымкі асоб, якія маюць ідэі праектаў, накіраваных на павышэнне грамадзянскай актыўнасці і ажыццяўленне сацыяльных змен у Беларусі. Тэрмін рэалізацыі праграмы — 31.03.25–30.04.25. Праграма праводзіцца адукацыйным хабам “Нацыя Лідараў”.

“Пясочніца” ўключае ў сабе наступныя складнікі:

- кансультацыйную падтрымку экспертаў па развіцці ідэй праектаў;
- дапамогу з боку Арганізатара па прасоўванні праектаў, доступ да сэрвісаў адукацыйнага хаба “Нацыя Лідараў” (памер і від дапамогі вызначаецца індывідуальна падчас правядзення Інкубацыйнай праграмы);
- стыпендыю ў памеры 300 (трыста) еўра на падтрымку ў развіцці ідэі і магчымай рэалізацыі праекта.

Колькасць Удзельнікаў Інкубацыйнай праграмы абмежаваная 9 асобамі/камандамі.

1.2. Конкурс праводзіцца з мэтай адбору ў Інкубацыйную праграму найбольш матываваных/адпаведных крытэрыям (п 3.1) Удзельнікаў і прадастаўлення ім дадатковых магчымасцяў для дапрацоўкі і рэалізацыі сваіх праектаў.

1.3. Удзел у Конкурсе бясплатны.

1.4. Арганізатарам Конкурсу выступае фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders. Уся інфармацыя пра ўмовы, правілы правядзення Конкурсу, тэрміны рэгістрацыі для ўдзелу і тэрміны правядзення Конкурсу размешчаная Арганізатарам на сайце (спасылка - https://nationofleaders.org/inkubaczyjnaya-pragrama/) і ў сацыяльных сетках адукацыйнага хаба “Нацыя Лідараў”.

1.5. У гэтым Рэгламенце выкарыстоўваюцца наступныя паняцці:

**Удзельнік** — фізічная асоба, якая дзейнічае ад свайго імя, ці каманда, якая складаецца з некалькіх фізічных асоб, што аб’ядналіся для дапрацоўкі і далейшай рэалізацыі ідэі праекта, і сведчыць свой удзел у Конкурсе ў адпаведнасці з Рэгламентам.

**Арганізатар** — фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders. Арганізатар вызначае тэму Конкурсу і патрабаванні да Заяўкі, склад журы і крытэрыі ацэнкі, умовы ўдзелу ў Інкубацыйнай праграме і ажыццяўляе іншыя неабходныя дзеянні, звязаныя з правядзеннем Конкурсу.

**Заяўка** — запоўненая згодна з патрабаваннямі і адпраўленая Удзельнікам у адпаведны тэрмін электронная рэгістрацыйная форма.

**Пераможца конкурсу** — Удзельнік, адабраны па выніках ацэнкі Заяўкі сябрамі Журы для ўдзелу ў Інкубацыйнай праграме.

**Журы** — эксперты, запрошаныя Арганізатарам для ацэнкі Заявак у адпаведнасці з Рэгламентам.

**2. Этапы і тэрміны правядзення Конкурсу**

2.1. Конкурс складаецца з наступных этапаў:

- прыём заявак на ўдзел у Конкурсе;
- адбор Пераможцаў Конкурсу;
- інфармаванне Удзельнікаў пра вынікі Конкурсу.

Пасля правядзення Конкурсу рэалізуецца Інкубацыйная праграма.
2.2. Агульны тэрмін правядзення Конкурсу: 05.03.2025–28.03.2025.
Тэрміны асноўных этапаў:

- прыём Заявак: з 05.03.2025 па 16.03.2025;
- адбор Пераможцаў: з 17.03.2025 па 23.03.2025;
- інфармаванне Удзельнікаў пра вынікі конкурснага адбору: з 24.03.2025 па 28.03.2025.

2.3. Тэрмін правядзення Інкубацыйнай праграмы з 31.03.2025 па 30.04.2025.

## 3. Парадак рэгістрацыі і ўдзелу ў Конкурсе

3.1. Да ўдзелу ў Конкурсе дапускаюцца асобы, якім споўнілася 18 гадоў, якія бралі ўдзел як мінімум у адной адукацыйнай праграме хаба “Нацыя Лідараў” і маюць ідэю праекта, накіраванага на павышэнне грамадзянскай актыўнасці і ажыццяўленне сацыяльных змен у Беларусі.
3.2. Рэгістрацыя Удзельнікаў, якія жадаюць паўдзельнічаць у Конкурсе, ажыццяўляецца ў тэрмін, пазначаны ў п. 2.2. Рэгламенту, шляхам запаўнення Заяўкі (спасылка - https://forms.gle/gmLYLmeRTPjeZbe99).
3.3. Да ўдзелу ў Конкурсе прымаюцца Заяўкі, у якіх запоўненыя абавязковыя палі формы, неабходныя для ацэнкі п. 3.1.
3.4. Пры падачы Заяўкі Удзельнік:

- пацвярджае, што дзейнічае па ўласнай добрай волі ў асабістых законных мэтах і інтарэсах;
- гарантуе ўказанне ў Заяўцы праўдзівай інфармацыі, пацвярджае, што не выкарыстоўвае чужых персанальных дадзеных, правоў на выкарыстанне якіх заяўнік не мае;
- дае згоду на збор, сістэматызацыю, захаванне і апрацоўку персанальных дадзеных, звязаных з удзелам у Конкурсе і пазначаных у Заяўцы.

Згода на апрацоўку персанальных дадзеных можа быць адкліканая, пра што Удзельнік абавязваецца паведаміць Арганізатару ў пісьмовай форме.
3.5. Пераможцы Конкурсу самастойна аплачваюць любыя магчымыя падаткі, звязаныя з удзелам у Інкубацыйнай праграме (атрыманне грашовай стыпендыі, атрыманне кансультацыйных, адукацыйных ці іншых паслуг), калі гэтага вымагае заканадаўства краіны падатковай рэзідэнцыі Удзельніка.
3.6. Удзельнік абавязаны прытрымлівацца добрасумленнасці і падыходаў паважлівай камунікацыі ў дачыненні да Арганізатараў і іншых Удзельнікаў на ўсіх этапах Конкурсу, пералічаных у п. 2.1., а таксама пасля яго завяршэння; выконваць рэкамендацыі прадстаўнікоў Арганізатара, якія забяспечваюць парадак і бяспеку Удзельнікаў.

## 4. Парадак правядзення Конкурсу і Інкубацыйнай Праграмы

4.1 Парадак правядзення прыёму заявак: анансаванне Конкурсу ў сацыяльных сетках і на сайце адукацыйнага хаба “Нацыя Лідараў”, адначасова збор заявак праз форму, спасылка на форму ў анонсах. Прыём заявак заканчваецца 16.03.25 а 23:59 па беларускім часе.
4.2. Разгляд Заявак на ўдзел ажыццяўляецца Арганізатарам, які для іх ацэнкі запрашае сябраў Журы ў складзе 3 (трох) экспертаў.

4.2.1. Арганізатар разглядае заяўкі на адпаведнасць крытэрыям удзелу (п.3.1.) і перадае іх для ацэнкі сябрам Журы. Арганізатар пакідае за сабой права не разглядаць пададзеную Удзельнікам Заяўку, калі яна змяшчае няпоўную або не адпаведную патрабаванням інфармацыю.

4.2.2. Ацэнка заявак ажыццяўляецца сябрамі Журы паасобку на падставе крытэрыяў адбору (п 5.4.) і перадаецца Арганізатару ў выглядзе запоўненай формы ацэнкі.

4.2.3. Арганізатар на падставе найбольшай сумы балаў, атрыманай Заяўкай паводле ацэнкі сябраў Журы, адбірае 9 (дзевяць) Удзельнікаў, якія становяцца Пераможцамі Конкурсу.

4.2.4. Пры наяўнасці спрэчных пытанняў, напрыклад аднолькавай колькасці балаў ці  недастатковай колькасці заяўнікаў, рашэнне прымае Арганізатар. Для гэтага ён мае права правесці інтэрв'ю з Удзельнікамі і (або) звярнуцца да сябраў Журы па дадатковую ацэнку.

4.3. Інфармаванне Удзельнікаў пра вынікі Конкурсу адбываецца праз кантактныя дадзеныя, пакінутыя ў Заяўцы. Арганізатар бярэ на сябе адказнасць у вызначаныя тэрміны (п. 2.2) праінфармаваць кожнага з Удзельнікаў пра вынікі конкурснага адбору, а Удзельнікі — азнаёміцца з інфармацыяй.

4.3.1. Адказнасць Пераможцы — зрабіць наступны крок, апісаны ў лісце. Пераможца мае права адмовіцца ад удзелу ў Інкубацыйнай праграме, паведаміўшы пра гэта ў пісьмовай форме на адрас contact@nationofleaders.pl. Удзельнікі не маюць права перадаваць і (або) іншым чынам саступаць свае правы, звязаныя з удзелам у Конкурсе і Інкубацыйнай праграме, трэцяй асобе (асобам).

4.3.2. У выпадку адсутнасці адказу ад Пераможцы ў вызначаныя тэрміны (п. 2.2) права на ўдзел у Інкубацыйнай праграме пераходзіць да Удзельніка, чыя Заяўка набрала наступную па велічыні суму балаў.

4.3.3. Удзельнікі, якія не перамаглі, маюць права запытаць зваротную сувязь па ацэнцы Заявак сябрамі Журы.

4.4. Рэалізацыя Інкубацыйнай праграмы ўключае ў сябе:

- кансультацыйную падтрымку, магчымасць атрымаць дапамогу ў прасоўванні праекта, доступ да сэрвісаў "Нацыі Лідараў" — канкрэтна вызначаецца ў камунікацыі Пераможцы і Арганізатара падчас рэалізацыі Інкубацыйнай праграмы "Пясочніца";
- стыпендыю ў памеры 300 еўра на падтрымку стварэння і рэалізацыі праектаў, накіраваных на павышэнне грамадзянскай актыўнасці і ажыццяўленне сацыяльных змен.

**5. Журы Конкурсу і працэдура ацэньвання Заявак**

5.1. Журы Конкурсу складаецца з 3 экспертаў. У мэтах бяспекі склад Журы не апублічваецца.

5.2. Сябры Журы запрашаюцца Арганізатарам з улікам іх прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы грамадзянскай адукацыі/дзейнасці, досведу і падзялення каштоўнасцяў фонду грамадзянскага развіцця Nation of Leaders.

5.3. Журы ацэньвае перададзеныя Арганізатарам Заяўкі, папярэдне правераныя на адпаведнасць фармальным крытэрыям.

5.4. Пры ацэнцы Заявак Журы кіруецца наступнымі крытэрыямі:

- адпаведнасць ідэі накіраванасці на сацыяльныя і грамадзянскія змены ў Беларусі;
- якасць апісання ідэі праекта ў Заяўцы;
- рэалістычнасць/рэалізуемасць праекта;
- магчымы ўплыў праекта на беларускае грамадства;
- інавацыйнасць ідэі.

5.5. Кожны крытэрый ацэньваецца па шкале ад “0” да “5” балаў, дзе “0” — адсутнасць інфармацыі, “1” — мінімальная адпаведнасць крытэрыю, “5” — максімальная адпаведнасць.
5.6. Сябры Журы самастойна ацэньваюць кожную Заяўку. Запоўненыя формы ацэнкі перадаюцца Арганізатару, пасля чаго балы суміруюцца Арганізатарам для фарміравання канчатковай ацэнкі Заяўкі і вызначэння Пераможцаў.
5.7. У выпадку канфлікту інтарэсаў пры ацэнцы Заяўкі сябра Журы абавязуецца праінфармаваць пра гэта Арганізатара, Арганізатар — выбраць для ацэнкі гэтай Заяўкі іншага эксперта.

**6. Заключныя палажэнні**

6.1. Арганізатар пакідае за сабой права дапаўняць і (або) змяняць Рэгламент. У выпадку змены тэрміну правядзення Конкурсу, умоў рэалізацыі Інкубацыйнай праграмы, іншых змен Арганізатар публікуе абноўлены Рэгламент на сайце. Змены Рэгламенту правядзення Конкурсу ўступаюць у сілу з моманту іх апублікавання. У выпадку ўнясення змен падчас правядзення Конкурсу і (або) Інкубацыйнай праграмы Арганізатар абавязаны праінфармаваць пра гэта Удзельнікаў.
6.2. Усе спрэчкі і рознагалоссі, якія могуць узнікнуць пры правядзенні Конкурсу, вырашаюцца шляхам перамоў паміж Арганізатарам і Удзельнікам/Удзельнікамі на аснове добрай волі і ўзаемапаразумення. Звязацца з Арганізатарам можна праз электронную пошту contact@nationofleaders.pl.
6.3. Падача Заяўкі на ўдзел у Конкурсе азначае поўную згоду з Рэгламентам яго правядзення.
6.4. Усе правы на інтэлектуальную ўласнасць, створаную Удзельнікамі ў ходзе Конкурсу і прадстаўленую для ацэнкі Журы, належаць Удзельнікам.